Валер Булгакаў

## Паслоўе

“Беларуска-расійская інтэграцыя” — адзін з самых балёвых пунктаў беларускага грамадзтва. Лукашэнка і яго партнэры з расійскага боку шмат зрабілі для таго, каб пранезалежніцка настроеная частка нашага грамадзтва яе гідзілася, не жадала падыходзіць да яе зь цьвярозымі ацэнкамі, бачыла ў гэтай інтэграцыі паважную пагрозу для існаваньня самой беларускай дзяржавы. Таму “інтэграцыйная” тэма часам робіцца закладніцай самадастатковых палітычных стратэгіяў, для якіх нічога ня значыць дабро беларускага народу. Наша кніга была напісаная, каб даць адказ незалежнаму беларускаму грамадзтву на пытаньне, што такое беларуска-расійская інтэграцыя з гледзішча эканомікі, палітыкі, культуры і стратэгічнай бясьпекі абедзьвюх краін.

У афіцыйнай трактоўцы “інтэграцыя” паўстае як складаны супярэчлівы працэс, які, аднак, спрыяе ажыўленьню эканомікі й мацуе бясьпеку Беларусі. Зьмешчаныя ў нашай кнізе эканамічныя аналізы сьведчаць, што гэта толькі часткова так. Лукашэнкавы інтэграцыйныя ініцыятывы сапраўды падоўжылі жыцьцё савецкай прамысловай базе на Беларусі, уласьцівым ёй вытворчым адносінам. Але нацыі давялося заплаціць за гэта высокую цану. Як бліскуча паказвае ў сваім тэксьце “Эканамічная палітыка Лукашэнкі” Віталь Сіліцкі, Беларусь цягам апошніх васьмёх гадоў у сутнасьці вярнула сабе статус эканамічнай калёніі Расіі. Поўная залежнасьць ад расійскіх энэрганосьбітаў, “зьвязанасьць” мытнай, інвэстыцыйнай, крэдытнай і тарыфнай палітыкай Расіі зрабіла наша краіну надзвычай чуйнай да найменшых зрухаў палітычнага і эканамічнага курсу Крамля.

Адмовіўшыся ад інтэграцыі ў міжнародную эканамічную супольнасьць, Лукашэнка і яго паплечнікі палічылі за лепшае скіраваць краіну на лацінаамэрыканскі варыянт разьвіцьця, г.зн. прывязаць айчынную эканоміку да рынку мэтраполіі, калі беларускі вытворца абслугоўвае расійскага спажыўца. “Адзіная эканамічная прастора Саюзнай дзяржавы”, дзеля ўзьнікненьня якой беларускае кіраўніцтва прыклала гэтулькі намаганьняў, уяўляе сабой ня што іншае, як досыць ізаляваную ад рэшты сьвету гаспадарчую субсыстэму з пэўнымі прыкметамі аўтаркіі. Няма нічога дзіўнага ў тым, што лёгіка разьвіцьця і стагнацыі гэтай “адзінай эканамічнай прасторы” часам не супадае з дынамікай росту/спаду сусьветнай эканомікі.

Эканамічная палітыка беларускага рэжыму грашыць непасьлядоўнасьцю, пэрыяды лібэралізацыі гаспадарчай дзейнасьці перамяжаюцца з адкатамі да адміністрацыйных мэтадаў кіраваньня эканомікай. Гэтага, на жаль, нельга ска-

зацьпра культурную палітыку Лукашэнкі. Выкарыстоўваючы для прыкрыцьця рыторыку беларуска-расійскага яднаньня, лукашэнкаўцы ўвесь час свайго панаваньня не давалі беларусам стаць самімі сабой — эўрапейскай нацыяй з моцна разьвітой культурнай ідэнтычнасьцю. Для гэтага беларускі рэжым ня грэбаваў ні “плебісцытарна ўгрунтаваным” скасаваньнем беларускіх нацыянальных сымбаляў (для беларускага грамадзтва гэты акт сапраўды быў сымбалічны, бо азначаў поўнамаштабны наступ на асноўныя здабыткі беларускае культуры), ні зьнішчэньнем нацыянальнай, г.зн. беларускамоўнай, сыстэмы адукацыі, ні рэзкім зьмяншэньнем выданьня друкаванай прадукцыі на беларускай мове — а нашто, калі яе сілком выгналі са школы і ўнівэрсытэту?

Па сутнасьці, беларуская культура была прынесеная ў ахвяру эканоміцы, заданьням яе выжываньня. Гэтага ня скажаш пра беларускую інфармацыйную прастору, якая застаецца прадметам пільнага клопату лукашэнкаўцаў, непакой у якіх выклікае імклівае абмежаваньне інфармацыйнага сувэрэнітэту Беларусі, своеасаблівая капітуляцыя Беларусі перад расійскімі СМІ, што паважна зьмяншае інфармацыйныя рэсурсы беларускага рэжыму для маніпуляваньня грамадзкай думкаю.

Восем гадоў Лукашэнкавага ўрадаваньня сталі для беларускай культуры цяжкім выпрабаваньнем, а для яе дзеячоў — суровай праверкай на грамадзянскую мужнасьць. Гэтыя восем гадоў чорным ценем кладуцца на расійскую і тутэйшую мяшаную, каляніяльную культурную традыцыю на Беларусі, прадстаўнікі якіх сваёй маўклівай падтрымкай рэжыму Лукашэнкі навочна давялі сваё сапраўднае прызначэньне: стаяць на варце дасягненьняў расійскага культурнага імпэрыялізму на Беларусі, спрыяць выцясьненьню беларускае культуры за рамкі асноўных грамадзкіх патрэбаў. Становіцца ўсё больш ясна, што нават найбольш пасьпяховыя інфармацыйныя, адукацыйныя, палітычныя праекты, ажыцьцёўленыя прадстаўнікамі гэтых культурных традыцыяў, ня столькі мацуюць грамадзянскую супольнасьць, колькі судзеюць рэкалянізацыі Беларусі, заганяюць яе ў стан транзытнай тэрыторыі, пазбаўленай усякай самабытнасьці, свайго роду буфэру паміж аўтарытарнай Расіяй і дэмакратычнай Эўропай. Пра гэта ўскосна гаворыць і нізкая інтэнсіўнасьць контразахадаў з боку беларускага рэжыму да расійскамоўных СМІ “дэмакратычнай арыентацыі” або да грамадзка-палітычных ініцыятываў, якія ў сваёй візуальнай рэкляме паслугуюцца расійскай мовай. Дэмакратычным сілам ужо цяпер неабходна вызначыцца наконт таго, што пасьля падзеньня Лукашэнкі беларускай культуры, усяму мнагаквецьцю праектаў, якія спрыяюць яе ўмацаваньню, мусіць быць нададзеная поўнамаштабная дзяржаўная падтрымка як найбольш пацярпеламу ў змаганьні з аўтарытарным рэжымам боку.

Настойлівасьць, зь якой Лукашэнка з купкай сваіх паплечнікаў праводзіць у жыцьцё свае інтэграцыйныя ініцыятывы, выяўляе таксама ўсю абмежаванасьць іх культурнага сьвету. Карціна сьвету, укарэненая ў сьвядомасьці гэтых асобаў,





якіх без нацяжкі можна назваць культурнымі інвалідамі, была сфармаваная за часамі існаваньня савецкай імпэрыі, таму яна “засьмечаная” анахранічнымі стэрэатыпамі камуністычнай прапаганды — зь яе разгулам ксэнафобіі й культам грубай сілы, пошукам ворагаў, мысьленьнем у катэгорыях “свой-чужы” і ўспрыманьнем Масквы як цэнтру ўласнага культурнага сусьвету.

Тое, што сьвядомасьць ініцыятараў “беларуска-расійскай інтэграцыі” яўна не вызначаецца чысьцінёй, паказвае і стала прысутная ў іх рыторыцы тэрміналёгія. Так, ужо гадамі напоўніцу выкарыстоўваюцца выразы-хімэры накшталт “Саюзная дзяржава”, якія ня маюць яснага сэнсавага напаўненьня. Характар іх словаўжываньня як найлепей сьведчыць пра фікцыйнасьць, цьмянасьць інстытуцыйнага афармленьня “органаў саюзнае ўлады”, пра іх прынізьлівую залежнасьць ад бягучай палітычнай кан’юнктуры. Гэта, між іншага, даводзіць інтэграцыйная рыторыка Лукашэнкі, які без асаблівай шкоды для сваёй палітычнай кар’еры ў Расіі нацягвае на сябе маску гарачага панслявянскага дактрынэра, прыхільніка ўсеславянскага адзінства, тымчасам як для беларускай публікі ён ня грэбue паўстаць у абліччы асьцярожнага нацыяналіста, будаўніка беларускай дзяржавы.

“Саюзная дзяржава”, становячы сабой кульмінацыйны момант палітычнага збліжэньня Беларусі й Расіі, адначасна функцыянуе ў рэжыме “інстытуцыйнага фантому”. Гэта выгадна для рэалізацыі сапраўдных інтарэсаў беларускіх і расійскіх палітычных элітаў, якія, як выяўляецца, па-ранейшаму зацікаўленыя ў адстойваньні адных інтэграцыйных ініцыятываў і гамаваньні другіх. Гэтыя інтарэсы могуць радыкальна разыходзіцца: так, беларусы найбольш заклапочаныя ў абароне палітычнымі сродкамі пазыцыяў айчынных вытворцаў на расійскім рынку, расійцы ж, апрача прасоўваньня свайго капіталу на беларускі рынак, імкнуцца ўплываць на парадак прыняцьця беларускім кіраўніцтвам важных палітычных рашэньняў, на яго культурную і інфармацыйную палітыку. Як вынікае з аналізу Юрася Ліхтаровіча, па кароткай паўзе, выкліканай упадкам СССР, з новай сілай абвастрылася ранейшая хвароба расійскіх палітычных элітаў — імпэрская параноя. Расійскія палітыкі, так і не навучаныя горкім гістарычным досьведам, ізноў будуюць пляны дасягненьня стратэгічнага кантролю над Сярэдня-Ўсходняй Эўропай і іншымі рэгіёнамі сьвету, якія маюць важнае геапалітычнае значэньне.

Квазінатуральная, хімэрычная прырода кіраўнічых органаў “Саюзнае дзяржавы” з дастатковай відавочнасьцю паказвае, што пры іх стварэньні было максымальна ўлічана спэцыфічна беларускае разуменьне дэмакратыі, і сьведчыць, што іх фармаваньне адбылося па ініцыятыве беларускага боку. Па сутнасьці, яны зьяўляюцца зьлепкам зь беларускай палітычнай рэальнасьці, у якой шмат якія інстытуты дзяржаўнае ўлады зьведзеныя да надзвычай фармальнага статусу і ня маюць вагароў уплыву на вызначэньне палітычнага курсу краіны. Бюракратычны характар “Саюзнае дзяржавы”, якая, перафразуючы Віталя Сіліцка-

га, задумвалася Лукашэнкам як палітычная агенцыя для збыту беларускай прадукцыі на расійскім рынку, абумоўлівае арганічнае непрыняцьце мадэрнісцкіх прапазыцыяў расійскага боку, скіраваных на рацыяналізацыю ейнага інстытуцыйнага ўладкаваньня. Халоднае адчужэньне ў беларускага боку выклікае ня толькі пэрспэктыва прыняцьця “Канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы”, але і магчымасьць усеагульных і роўных выбараў у “Саюзны парлямэнт”, у якім беларуская дэпутацыя ня зможа эфэктыўна блякаваць нявыгадныя для сябе пастановы.

Папярэднія вынікі палітычнага зьбліжэньня Беларусі й Расіі не пакідаюць найменшага сумневу ў тым, што кіраўніцтвам абедзьвюх краін будуць усяляк блякавацца рашэньні, якія парушаюць наяўны балянс сілаў у “Саюзнай дзяржаве”. Далейшаму аб’яднаньню Беларусі й Расіі таксама замінацьмуць супярэчнасьці, якія назапасіліся цягам апошніх гадоў. Інстытуцыйны канфлікт, закладзены ў падмурак “Саюзнай дзяржавы” магчыма, саступіць у сваёй вастрыні асноўнай калізіі эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі — узаемаадштурхоўваньню беларускай, у якой дамінуе дзяржаўны капітал і якая перажывае вялікія цяжкасьці зь яго фармаваньнем, і расійскай эканамічнай мадэлі. Таму найхутчэй “гульня ў незалежнасьць” для першага беларускага прэзыдэнта канчаткова зробіцца цікавейшай за “гульню ў інтэграцыю”.

Цяжкасьці, зь якімі сустрэлася беларуская дзяржава цягам першае дэкады незалежнасьці, калі пад сумнеў, здавалася, была пастаўлена сама яе незалежнасьць, тлумачацца вузінёй і неразьвітасьцю культурнага сьветагляду беларусаў. Будзем спадзявацца, што нацыя годна скарыстаецца з такога ўнікальнага шанцу на адстойваньне сваіх культурных правоў, які дае ёй палітычная незалежнасьць.